# Фронт у стане гатоўнасьці

**12 сакавіка ў Менску прайшло чарговае паседжаньне Сойму БНФ «Адраджэньне».**

Палітычную сытуацыю аналізавалі ў спавешчаньнях Зянон Пазьняк ("Пэрспэктывы дэмакратыі і дыктатуры"), Юры Хадыка ("Верагоднасьць прэзыдэнцкай сыстэмы і выбары") і Лявон Баршчэўскі ("Аб працы Вярхоўнага Савету і ўраду"). Паводле агульнага меркаваньня выступоўцаў, прэзыдэнцтва ў прапанаваным варыянце мае на мэце замацаваць уладу намэнклятуры на чале з Кебічам.

Тым ня менш Фронт сустрэне любую — прэзыдэнцкую ці парляманцкую — выбарчую кампанію ў стане гатоўнасьці. Вінцук Вячорка і Валянцін Голубеў зазначылі, што Фронт мае выразную праграму, імідж палітычнай сілы, якая трымае слова, і дзякуючы гэтаму стабільнае кола выбаршчыкаў. Яны распавялі пра пазытыўную выбарчую плятформу БНФ, здольную пашырыць яго электарат. Уладзімер Анцулевіч дэталёва спыніўся на спосабах арганізацыі збору подпісаў за фронтаўскага кандыдата ў прэзыдэнты.

Сойм прыняў тэкст паведамленьня, дзе выказаў трывогу з прычыны адкрытых парушэньняў правоў чалавека і свабоды слова ў краіне і назваў цяперашні рэжым у Беларусі «паліцэйскім».

І.С.




*Малюнак Лявона РАЗЛАДАВА*

**Свабода друку**

# Як пра нябожчыкаў: або добра, або нічога

## Цэнзарскія нажніцы пакуль у шуфлядзе

Журналісты ведаюць, што нашыя ўлады дужа ня любяць, калі пра іх напішуць у газэце ня ў стылі панэгірыку. Паводле няпісанага закону, пра начальства на любой пасадзе лепей пісаць як пра нябожчыкаў: або толькі станоўчае, або зусім нічога. Сёньня, здавалася б, прэса ня мае былога фундамантальнага значэньня, але й дагэтуль улады балесна рэагуюць на газэтныя публікацыі. Яны ніяк ня могуць дапусьціцца да думкі, што мы маем гэткае ж права пісаць пра іх, іхныя ўчынкі, як яно, начальства, — кіраваць. Што ёсьць унівэрсальнае права на атрыманьне й распаўсюджаньне інфармацыі.

Чацьвертая ўлада — самая безуладная. Нехта нябачны заўсёды вырашаў за цябе: пра гэта можна, дазволена, а пра тое — ані. Сёньня мы яшчэ толькі спрабуем самі вызначаць сабе межы: нецікава, неэтычна, небясьпечна... Цэнзура цяпер у глыбокім падпольлі. Названая завуалявана, яна пакуль толькі раіць, гатовая ў кожны момант зноўку прыступіць да выкананьня сваіх заўсёдных абавязкаў, галоўны зь якіх — душыць свабоду слова. А пакуль, калі вы нешта ведаеце, вам ветліва прапануюць заключыць дамову з цэнзарскай управаю (усім, маўляў, трэба есьці хлеб!). Калі вы адмовіцеся, вам спакойна паведамяць: як сабе хочаце, але мы ўсё адно кантралюем зьмест усіх выданьняў. Карацей, цэнзуры няма (паводле Закону), але яна існуе. Вы зь ёй не жадаеце мець ніякіх дачыненьняў, але яна робіць гэта аднабакова.

## Камандзеры прэсы

Памятаю, калі ў Расеі зьмяніліся кіраўнікі ўраду, адна газэта выйшла з «шапкай» — «Кончилась гайдарономика, началась черномырдономика». Я міжволі парадаваўся разьняволенасьці маскоўскіх калегаў. Было чаго пазайздросьціць. Наш родны КПБоўскі Саўмін кіраваў і кіруе «mass media» па-ранейшаму, па-цэкоўску. Маючы ў распараджэньні кішэнныя суды, ледзь ня ўсё высокае начальства паспрачалася са СВАБОДАЮ наконт уласных «гонару ды годнасьці». Ані разу суд у нас не абараніў журналіста, толькі — начальства. Зь цікавасьцяй чакалі мы рэакцыі на (урэшце!) вольнасьці асобных газэтаў, якія пракамэнтавалі студзеньскія падзеі як «погрибение и кебичевание». Начальства наша помсьлівае, але яму, здаецца, ужо не да гонару, калі ўсім відавочна, што яно давяло краіну да катастрафічнага стану. Маўчыць яно, нібы мовы пазбавілася, але «камандаваць прэсай» усё адно карціць.

Карацей кажучы, на Ўсходзе са свабодай слова больш-менш няблага, на Захадзе быццам бы таксама. Мы ж нагадваем вучняў, змушаных пісаць дыктоўкі, тэксты якіх аднойчы і назаўсёды зацьвердзілі дзесьці ў «Минпросе» і «Политпросе». Пасьля падзеяў 15 лютага ведамства сп. Краўчанкі пачало абавязковую акрэдытацыю журналістаў замежных сродкаў інфармацыі. Не таму, што менавіта так належыць рабіць паводле міжнародных нормаў, а таму, што падзеі асьвятляюцца ня гэтак, як хочацца ўраду і як паслухмяна паведамляе ручная саўмінаўская прэса і БТ.

Прыкладам, замест таго каб напісаць «Население республики не поддержало кучку смутьянов, отщепенцев и нарушителей порядка», замежныя «mass media» паведамілі ўсё як было напраўду. Новы в.а. міністра ўнутраных справаў сьпяшаецца выслужыцца і выдатным чынам даводзіць усё да бязглузьдзіцы. Я маю на ўвазе слынны арышт актывістаў Партыі аматараў піва за іхныя сасіскі. Ва ўрадзе, няйнакш, чакалі, што замежнікі пракамэнтуюць гэты выразна фарсавы інцыдэнт прыблізна гэтак: «В Беларуси задержана организационная группа опасных преступников, посягнувших на устои советского государства». Усё гэта моцна нагадвае «чорныя» камэдыі на тэму палкоўніцкіх рэжымаў у розных какосавых ды бананавых дзяржаўках.

## Выкраданьне камунякаў

Ежы Урбан быў прэс-сакратаром пры апошнім камуністычным урадзе тады яшчэ ПНР. Штотыдзень ён ладзіў прэс-канфэрэнцыі, на якія асабліва замежныя карэспандэнты сьпяшаліся навыперадкі. Я таксама любіў паглядзець па тэлевізары тыя сустрэчы сп.Урбана з журналістамі. Дасьціпны прэс-сакратар слова не пазычаў. Напрыклад, яго пыталі: што пан можа сказаць пра польскія прэзэрватывы — кажуць, яны кепскай якасьці? (Уяўляю Кебічавага прэс-палкоўніка Замяталіна ў падобнай сытуацыі...) Ежы Урбан (дарэчы, пажылы чалавек) адказваў адразу: нічога не магу сказаць, я імі не карыстаюся.

Сп. Урбан цяпер рэдагуе ілюстраваны каляровы тыднёвік «Не», шалёна папулярны сярод пэўнай часткі палякаў. Унікальнасьць «Не» ў тым, што гэтае «жоўтае» выданьне — выключна палітычнае. Дастаецца ў ім аднолькава і левым, і правым, і прэзыдэнту, і ксяндзам, якіх галоўны рэдактар вельмі ня любіць. Карыкатуры, загалоўкі, зьмест ня толькі зьдзеклівыя, але часьцяком папросту непрыстойныя. Чую, як мяне нашыя пільныя начальнікі, у душы кожнага зь якіх паразытуе цэнзар, строгім голасам папярэджваюць, гаворачы вядомае гарбачоўскае выслоўе: «Демократия — не вседозволенность». Слушна! Але ўсёнедазволенасьць — пагатоў не дэмакратыя.

У адным зь лютаўскіх нумароў «Не» пад назваю «Выкраданьне камунякаў» зьмешчана карэспандэнцыя зь Беларусі. Апавядаецца ў ёй пра сумныя студзеньскія падзеі, пачынаючы ад візыту Клінтана й выкраданьня буракявічусаў і скончаючы парляманцкімі разборкамі. У зацемках «Спэрма як гераін» сп. Урбан (сам ён намаляваны побач у непрыстойным выглядзе) кпіць з ксяндзоў, якія лічаць продаж прэзэрватываў злачынствам накшталт распаўсюджаньня наркотыкаў. Урбанам таксама напісаны рэтраспэктыўны агляд «Срач і польская справа» (з адлаведным малюнкам), дзе пачынаючы ад каралёў і скончаючы апошнім соймам разглядаюцца выпадкі, зьвязаныя з клязэтам, якія нібы паўплывалі на пэўныя палітычныя справы.

Каб «Не» выдаваўся ў Менску, даруйце мне калямбур, ён бы даўно ўжо не выдаваўся. Бо нашыя палітыкі гэткія высакародныя, далікатныя, уражлівыя, дарма што зусім нядаўна ў цэкоўскіх пастановах яны заклікалі да крытыкі й самакрытыкі. Каб жа разам зь ермалавічусамі летувіскія спэцслужбы пакралі б і нашых, выбачайце, камунякаў, дык можа тады беларускую справу болей не заганялі, яшчэ раз прабачце, у той «срач».

## Польскі заапарк

Своеасаблівым тэлевізійным «Не» ёсьць лялечнае шоў «Польскі заапарк», якое з посьпехам існуе на варшаўскай TV каля трох гадоў. У выглядзе жывёлін, зьвяроў, птушак падаюцца найбольш заўважныя палітыкі, пачынаючы ад Валэнсы — «ільва» (жонка Данута — «мышка»), кола якіх штораз пашыраецца. Непрыстойнасьць тут не дапускаецца, але зьедлівасьць, кпіны, зьдзек — калі ласка! Усялякія соймавыя разборкі, скандалы праз тыдзень уся Польшча назірае ў тэлезьвярынцы... Да прыкладу, зьяўляецца на сцэне ВС спадарства Грыб, Лукашэнка і, скажам, Пазьняк, а праз якія сем дзён БТ паказвае парляманцкае шоў з удзелам жабы, каня і птушкі дзятла. Фантастыка!




**Здымак з сэсіі Вярхоўнага Савету Беларусі**

Па першым часе я штотыдзень глядзеў гэтыя польскія палітычныя тэлеспэктаклі, але потым яны надакучылі, як і паседжаньні нашага ВС. Бадай кожнага разу, калі бачыў «Польскі заапарк», мне думалася: у нас бы такое лялечнае шоў назаўтра ж забаранілі. Гэта адпавядала б паняцьцям «сац. дэмакратыя» і «соц. плюрализм мнений», — як любіў ня надта пісьменна паўтараць маскоўскі генсэк.

Самае цікавае, што аднойчы Л.Валэнса ды іншыя палітыкі спаткаліся з акторамі, якія іх пераймаюць, і лялькамі, якія іх імітуюць у «Польскім заапарку». Пасьмяяліся дый разышліся. Нікога не арыштавалі, і перадачы не забаранілі.

## Рэзюмэ

Калісьці спадарыня Сухоцкая, будучы прэм'ерам РП, наведала Горадню, дзе сустрэлася з тутэйшымі палякамі. Прысутныя скардзіліся ёй, што беларускі ўрад ня хоча фінансаваць польскі рух. А вось польскі, маўляў, не шкадуе грошай на беларускую справу ў Польшчы... Адыёзна вядомы граф Прушынскі нават зьвярнуўся да спадарыні прэм'ер, каб яна дала каманду польскім журналістам і тыя асьвятлялі гэткую несправядлівую сытуацыю. Адказ прагучаў, што было для ўсіх неспадзявана, досыць непрыхільна: мы прэсай не камандуем! Вось так. Уласных газэтаў тамтэйшы ўрад таксама ня мае. Не дадумаўся яшчэ, хоць кіруе сёньня лявіца — збольшага камуністы былыя, ды зусім ня тыя, што ў нас. Наш урад ашчаджае ня толькі на польскай, а перадусім на беларускай справе, наш урад прагне камандаваць прэсай, і ў нас няма пакуль свайго Ежы Урбана. Ёсьць затое сьмешны парлямант, зь якога можна было б зрабіць выдатны лялечны заапарк.

Сяргей МАКСІМОВІЧ

# Мечыславу Грыбу падабаюцца немаладыя, але зграбныя жанчыны

**Заняўшы апартамэнты Шушкевіча, генэрал Грыб мэблю не перастаўляў і партрэт Леніна пакуль не павесіў. Ён пачаў з жанчын.**

Найперш, генэрал выправіў з прыёмнай Шушкевічаву сакратарку, а на ейнае мейсца пасадзіў Валянціну Саладоўнікаву, якая выклікае ў апараце ВС захапленьне сваёю добра складзенаю постацьцю.

Другую жанчыну Мечыслаў Грыб «выпісаў» аж зь Віцебску. Ганна Падрэз працавала там у аблвыканкаме, а цяпер стала кансультантам Старшыні ВС (па якіх пытаньнях яна будзе яго кансультаваць — невядома). Мечыслаў Грыб упершыню зьявіўся зь ёю на публіцы 10 сакавіка падчас сваёй паездкі ў Жлобін і Касьцюковічы. Людзі між сабою цікавіліся: ці ня жонка гэта Грыба — надта ж молада і эфэктна выглядала яна побач з генэралам. Аднак для Ганны Падрэз больш важна тое, што яна стала сталічнаю жыхаркаю. У хуткім часе віцебская кансультантка павінна атрымаць кватэру ў Менску.

Чакаецца, што наступным кватэру атрымае палкоўнік Станіслаў Васілеўскі, які быў прасунуты Грыбам у апарат Рады Бясьпекі. Ён прыехаў з Масквы, дзе служыў у расейскім Міністэрстве бясьпекі.

Іван СІДАР



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Купонная «бомба» пад украінскую самастойнасьць

## Расейскія спэцслужбы і беларуская мафія падазраюцца ў супольнай дывэрсіі супраць эканомікі Ўкраіны

**Праз некалькі дзён у Запарожжы (Украіна) мае адбыцца судовы працэс над фальшывамманэтнікам веку, дырэктарам менскай камэрцыйнай фірмы «Алгрым» Аляксандрам Пісьменным.**

Паводле зьвестак сьледзтва, спадар Пісьменны дзесьці напрыканцы 1991 году арганізаваў у польскім горадзе Лодзі падпольную друкарню дзеля вытворчасьці фальшывых украінскіх купонаў і нямецкіх марак. Абсталявана гэтае прадпрыемства было за апошнім словам тэхнікі (кошт усіх прыладаў, паперы і фарбавальнікаў, як падлічылі спэцыялісты, складаў 300 тысячаў даляраў) і выпускала «прадукцыю» даволі высокай якасьці. Дастаўка і збыт фальшывак таксама былі наладжаныя выдатна. Варта адзначыць, напрыклад, што кампаньёнам Пісьменнага быў сам «Кароль» — адзін з аўтарытэтаў менскага крымінальнага сьвету.

Такім чынам амаль за год дзейнасьці міжнародны злачынны сындыкат, у які ўваходзілі каля 40 грамадзянаў Беларусі, Украіны і Польшчы запусьціў у абарачэньне прыкладна 200 тысяч DM і больш за 20 мільёнаў купонаў. Прычым найбольш пацярпелі ад фальшывамманэтнікаў якраз нашы ўкраінскія суседзі. Падробленыя купоны там збывалі гуртовымі партыямі, дайшло нават да таго, што фальшыўкамі выплочвалі заробак сваім супрацоўнікам многія камэрцыйныя фірмы Кіева, Харкава і Запарожжа. Нагадаем, што па тым часе курс украінскага купона да расейскага рубля быў амаль 1:1. Беларусі у гэтым пляне пашанцавала больш. Падробленыя дойчмаркі ў нас прадаваліся паштучна, і ахвярамі злачынцаў сталі ў асноўным людзі, якія выяжджалі ў Нямеччыну.. Там, дарэчы, і выявілі прадукцыю фабрыкі Пісьменнага і К$^{o}$. Фальшывамманэтнікі неўзабаве былі арыштаваныя. І вось тут ледзь ня здарыўся міжнародны ўкраінска-расейска-беларускі скандал.

Рэч у тым, што падчас сьледзтва, калі высьветлілася, якую агромністую колькасьць фальшывых купонаў завезьлі на Ўкраіну хлопцы Пісьменнага, у тамтэйшых дэтэктываў зьявілася падазраньне: а ці не замяшаная тут «рука Масквы»? На думку ўкраінскіх сьледчых, незаўважна даставіць з Польшчы праз усю тэрыторыю Беларусі цэлыя мяшкі грошай немагчыма. Хутчэй за ўсё, гэтая апэрацыя была сплянаваная і праведзеная расейскімі спэцслужбамі з маўклівай згоды КДБ Беларусі. Ды і стварыць падпольную друкарню ў Лодзі наўрад ці змог бы за ўласныя грошы бізнэсмэн Пісьменны, гэта яму аднаму было проста не па кішэні.

І яшчэ адзін факт, які насьцярожыў праваахоўныя органы Ўкраіны. У фірме «Алгрым» пад кіраўніцтвам Аляксандра Пісьменнага працавалі двое ўчарашніх супрацоўнікаў КДБ Беларусі. А такія людзі, як вядома, нават пасьля выхаду ў адстаўку застаюцца байцамі нябачнага фронту. Так што ўкраінскім сьледчым ёсць цяпер пра што задумацца. І хто ведае, можа і сапраўды вэрсія аб фальшывамманэтнай дывэрсіі расейскіх спэцслужбаў і беларускай мафіі на Ўкраіне пацьвердзіцца.

**Адам РОЎДА**

*Лявон БАРШЧЭЎСКІ*

# За Бэрмудзкім трохкутнікам

*(Пачатак у №№8,9)*

Трэці дзень канфэрэнцыі быў зноў ня надта каб цікавы: доўгія прамовы, размовы ўвогуле.

Абедаў я разам са спадаром Астахавым. Ён, ведаючы пра маю цікавасьць да літаратуры, сказаў мне, што таксама пачынаў кар'еру з вывучэньня літаратуры — напрыканцы 50-х гадоў у Ташкенцкім пэдінстытуце. А самым паважаным для яго выкладчыкам быў Сьцяпан Ліхадзіеўскі. Сп. Астахаў зьдзівіўся, калі я расказаў яму, што Ліхадзіеўскі быў досыць вядомы беларускі паэт і перакладчык, высланы калісь у далёкія ад Беларусі мясьціны (рэшту жыцьця ён пражыў у Ташкенце).

Вярнуўся ў нумар і знайшоў цыдулку ад сп. Гўардыёлы, што ён разьвітваецца са мною і ня можа назаўтра праводзіць да лётнішча. Шкада, я хацеў падараваць яму сякія-такія «памёнткі».

З польскім амбасадарам і ягонаю абяцанаю паездкаю па цікавых мясьцінах таксама, на жаль, нічога ня выйшла: якраз на перадпалуднавы час яму прызначыў аўдыенцыю міністар замежных справаў. Але ён і ягоная жонка, пані Бажэна, пакінулі мне свае варшаўскія каардынаты і сказалі, што можна спыніцца, калі што, у іхным доме.

Зь вячэраю была поўная няяснасьць, і я, урэшце, даеў сваё сала. Зрэшты, ня вельмі й пашкадаваў пра экзатычныя, але невядома з чаго прыгатаваныя мясцовыя стравы — які-небудзь чыльмоль ці хікара.

Экзотыка мне даспадобы ў іншым. На закрыцьцё канфэрэнцыі гаспадары падрыхтавалі тое, што бальшавікі называюць «культурнай праграмай», а папросту добры выступ фальклёрнага ансамблю сьпевакоў і танцораў. Вось дзе патыхнула старою і, відаць, аўтэнтычнаю індзейшчынай.

На заканчэньне на мове nahuatl яны сьпявалі гімн Богу-Сонцу (Туналь), і гэта было нешта неверагоднае:

*Кан калагуі Туналь*
*Ну-тэку, ту-тэку!*
*Нэш-кукуа, нэш-кукуа,*
*Кан калагуі Туналь*
*Ну-юлу-ну-юлу чу-га*
*Туналь тыт, Туналь тыт,*
*Туналь ма хсу...*

*(Як Сонца заходзіць, наш Бог,*
*Сэрца мне баліць,*
*сэрца мне баліць.*
*Як Сонца заходзіць,*
*Сэрца маё, сэрца маё...*
*Памірае — Сонца, Сонца!*
*— ад агню!!!)*

Дзеля гэтага напраўду варта было ляцець у іншы сьвет...

Вынік канфэрэнцыі быў досыць незразумелы: канчатковы дакумэнт не выпрацоўваўся. Але сальвадорскія прадстаўнікі асабліва настойвалі на прапанове стварэньня рэгіянальных структураў «культуры міру», маючы на ўвазе, што Сан-Сальвадор стаўся б цэнтральнаамэрыканскім асяродкам — вядома ж, на грошы ААН ды ЮНЭСКА. Я адразу зразумеў «гульню» і са свайго боку сказаў, што Менск быў бы найлепшым месцам для такога цэнтру ў рэгіёне Ўсходняй Эўропы. Што ж, гуляць дык гуляць...

І вось пачаўся заключны этап маёй эпапеі. Праводзіць мяне на лётнішча прыслалі маладую (і зграбную) дзяўчыну з МЗС у Сальвадоры. Прыехалі мы ў аэрапорт за больш чым гадзіну да адлёту, і Франсіска (гэта было ейнае імя) запэўнівала мяне ўсю дарогу, што фармальнасьці ў аэрапорце зоймуць пару хвілінаў. Яна ж доўга пыталася ў мяне, што за краіна Беларусь, які ў яе сьцяг, і я спрэзэнтаваў ёй апошні сьцяжок з тых, што меў.

У аэрапорце ў яе, аднак, «прабіўной» здольнасьці — патрэбнай, зрэшты, усюды на сьвеце — відавочна бракавала. Я сядзеў, размаўляў там з прадстаўніком арафатаўскай PLO сівавалосым спадаром Зэўды Тэрзі, а Франсіска з пашпартам і білетам усё не зьяўлялася. Урэшце яна прыбегла, скардзячыся, што ёсьць вялікія праблемы, бо зноў-такі ў мяне няма хоць бы транзытовай візы ў ЗША. Спадар Зэўды Тэрзі, які ўсё жыцьцё езьдзіў па сьвеце з рознымі сумнеўнымі пашпартамі — з прычыны адсутнасьці прызнанай усімі дзяржавы Палестыны — растлумачыў ёй, як трэба дзейнічаць (дзякуй яму за гэта), і тут жа засьпяшаўся на свой лятак.

...Да адлёту заставалася сем ці восем хвілінаў, калі прыбегла, задыхаўшыся, Франсіска. Усё, урэшце, было абладжана: што праўда, зноў давялося заплаціць са сваіх апошніх грошай 17 даляраў аэрапортавага збору.

Маямі — куды я ляцеў напачатку з Сан-Сальвадора — я пабойваўся: думаў, што зноў на мытні пачнецца бюракратычная валтузьня. Але там, побач з лацінаамэрыканцамі, да мяне паставіліся вельмі ветліва. Зноў-такі чатыры гадзіны мне давялося прасядзець у зале для TWOV (падарожнікаў бязь візы), але сэрвіс там — як на нашыя ўсё яшчэ «саўковыя» ўяўленьні — уражваў. Можна было колькі хочаш піць бясплатна кавы, гарбаты, кока-колы, тоніку або Ginger ale'у (гатунак ліманаду), колькі хочаш глядзець тэлевізар — і я ўпершыню змог крыху паглядзець зімовую Алімпіяду зь Лілехамэру. Тут у мяне была яшчэ адна прыемная неспадзяванка. Разгарнуў узятыя ў самалёце сальвадорскія газэты і на першай старонцы «Prensa grafica» (адна зь дзьвюх найбольш салідных там) убачыў каляровае фота з нашае канфэрэнцыі, дзе цэнтральная постаць — паміж дэлегатамі ад Калюмбіі і Сальвадора — я! Ведай нашых, беларусаў.

Трохі папсавалі мне настрой у маёй камфортнай, але вымушанай турме-чакальні тры чарнаскурыя маладыя хлопцы, якія паводзілі сябе ну надта ж ужо раскавана: уключалі на ўсю моц сваю музыку, скакалі пад яе, адзін гадзіны са дзьве (!) безупынна галасна размаўляў па тэлефоне... Ну ды Бог зь імі: прынамсі, нават на іхным фоне многія з нас жабракі й бамжы.

Вядомыя з маленства вершы Мікалая Ціханава ці нават Самуіла Маршака пра няшчасных нэграў у «ня нашым сьвеце» мітусіліся ў галаве, але я адчуваў, што ролі як бы памяняліся...

Чарговы safeguard здаў мяне праваднікам самалёта Маямі—Вена, і тут я адчуў пэўную палёгку. Усё-такі ляцім у Эўропу, большасьць суседзяў гаворыць па-нямецку, а з гэтай моваю мне ўсюды прасьцей... Прыкладам, мой сусед па крэсьле Міхаэль, чалавек недзе маіх гадоў, вяртаўся пасьля некалькіх месяцаў службовай выправы ў ЗША да сябе ў Нямеччыну: самалёт меўся рабіць прамежкавую пасадку ў Мюнхэне. Ён доўга распытваў мяне, як мы раней жылі за «жалезнаю заслонаю» і ці зможа рэальна Жырыноўскі дайсьці да ўлады ў Расеі. На апошняе пытаньне я адказаў: можа, калі Захад будзе па-ранейшаму цешыцца сваім «кніжным» успрыманьнем Расеі. Адказ жа на першае пытаньне доўжыўся ці ня цэлую гадзіну...

Добра-такі натаміўшыся пасьля дзесяці-з-паловаю-гадзіннага пералёту з Маямі ў Вену, у апошняй (горадзе маёй дзіцячай мары) я мусіў яшчэ цэлыя пяць гадзінаў чакаць самалёта на Менск. Вядома ж, у аэрапорце, бо візы «на выхад» не было. Дый грошай, праўду кажучы, таксама. Дзякуй Богу, што тут няма ніякіх safeguard'аў (хоць яны ўвогуле й прыемныя людзі — у Штатах), і ў аэрапорце можна было рабіць што хочаш. Як там было ў рускага народнага барда:

*Хочешь — спать ложись,*
*А хочешь — песни пой...*

Падрамаць у крэсьле трохі я падрамаў, бо ў часе пералёту ноч і сон былі амаль «украдзеныя» розьніцай часу (шэсьць гадзінаў паміж Маямі й Венаю), а песьняў, прызнаюся, не сьпяваў...

...Без праблемаў аформіў паперы на палёт да Менска і сеў дапісваць чарговую порцыю гэтых нататкаў. Наперадзе — апошняя частка досыць незвычайнага падарожжа з маршрутам (падумаць толькі): Менск—Франкфурт—Ню-Ёрк—Вашынгтон—Гватэмала—Сан-Сальвадор—Панчымалька—Сан-Сальвадор—Маямі—Мюнхэн—Вена—Менск. І гэта ня лічачы тых мясьцінаў, над якімі ляцеў (улучна з паўднёваю часткаю славутага Бэрмудзкага трохкутніка — па дарозе назад у Эўропу).

Што ж, сёй-той у розных канцох сьвету пачуў, што існуе такая краіна Беларусь. Відаць, і на гэтым добра. Бо што зробіш, калі сувэрэнная краіна—сябра ААН да гэтай пары ня мае прыстойнага каляровага часопіса пра сябе, хоць бы на адной ангельскай мове, калі няма, ці амаль няма, нармальных буклетаў, паштовак і г.д., калі й на беларускай мове ня знойдзеш у продажы нармальнай мапы Беларусі. Колькі ж нам чакаць таго ўраду, які б пачаў клапаціцца пра такія рэчы. Думаў я пра ўсё гэта ў сьціплым сваім камфортам ТУ-134 нашай роднай авіякампаніі BELAVIA, вяртаючыся.

# Дзень нараджэньня Туркмэнбашы

**Туркмэністан упершыню адсьвяткаваў нацыянальнае сьвята — дзень нараджэньня прэзыдэнта Сапармурата Ніязава.**

Сьвяткаваньне прайшло з сапраўды ўсходнім размахам. За тыдзень да гэтага дня быў праведзены працоўны суботнік, і зробленыя на ім грошы пералічаныя на рахунак міжнароднага і дабрачыннага фонду Туркмэнбашы. 54-годзьдзю правадыра прысьвяцілі здачу ва ўжытак новых жылых дамоў і прадпрыемстваў. Сам дзень нараджэньня вызначаўся шыкоўным сьвяткаваньнем на пляцах гарадоў, адкрыцьцём новых помнікаў прэзыдэнту, народнымі гуляньнямі й бясплатнымі пачастункамі на вуліцах.

**Аляксандар КАРПАЎ**
("Россия")



© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

# Жаночы народ

## Хто якога роду?

Каб народы дзялілі па родах, няцяжка было б вызначыць, хто да якога адносіцца. Прага да заваёваў, улады, падначальваньня сабе, цяга да войнаў, рабункаў, разбурэньня... Гэта — мужчынскі народ. Уменьне дараваць, а не рабіць крыўды, уменьне падначаліцца, скарыцца на час, каб ператрываць: нараджаць і гадаваць дзяцей, залячыць раны, аднавіць страху і зноў распаліць у камінку, нарэшце, захаваць свае песьні, калі мова забароненая. А ўсё дзеля таго, каб перамагчы не адразу, сёньня, а ў часе. Такі народ, натуральна, — жаночы...

Так пісала мая ўлюбёная пісьменьніца Ана Бляндыяна пра свой румынскі народ. Аднак у ейных радкох як у люстэрку бачу нас, беларусаў. Аўтарка рытарычна пытаецца: дзеля чаго патрэбна болей адвагі — каб забіваць або каб цярпець, абараняючы жыцьцё? Не! Захоп чужых земляў ні ў якім разе ня больш гераічны за тысячагадовае адстойваньне сваёй. Так мяркуе Ана Бляндыяна.

## Сьвятыя

Заступнік Польшчы — сьв. Станіслаў, Летувы — сьв. Казімер, Расеі — здаецца, Георгі Пабеданосец, Украіны — сьв. Уладзімер. Паколькі сьв. Казімер патранаваў Літве гістарычнай, усю спадчыну якой атрымаў маленькі летувіскі народ пры маўклівай згодзе іншых, мы маглі б, вядома, прэтэндаваць на яго таксама, але ці мае гэта сёньня сэнс? Два стагодзьдзі русыфікацыі, бадай, выключылі магчымасьць шанаваць як свайго апекуна каталіцкага, а не праваслаўнага сьвятога.

Кажуць, што заступніцай Беларусі ёсьць Эўфрасіньня Полацкая, і гісторыя зь ейным крыжам вельмі сымбалічная. Маўляў, нібы папараць-кветку, мы яшчэ мусім адшукаць яго недзе ў амэрыканскіх сэйфах. Магчыма.

Сапраўдныя сьвятыя — тыя, каго і ў постсавецкай Беларусі апантана ганяць і цкуюць... Мне здаецца, што найлепей увасабляе, сымбалізуе трагічны гістарычны лёс Беларусі і поўныя драматызму падзеі ейнага сёньняшняга жыцьця менавіта постаць вуніяцкага сьвятога Язафата Кунцэвіча, сама вуніяцкая царква.

Як там ні было, але сёньня за заступніцу Беларусі ўважаюць Эўфрасіньню Полацкую — адзіную жанчыну сярод чатырох сьвятых-мужчын у навакольных краінах. Жанчыны — кволы пол.

## Помнікі

У расейцаў ёсьць «Родина-Мать» зь вядомага плякату. Добра вядомы таксама помнік аграмаднай кабеты зь мечам, пастаўлены на мейсцы здэмантаванага велізарнага Сталіна ў горадзе Валгаградзе. Карацей, Расея-матухна.

У летувісаў ёсьць у спаленай вёсцы Пірчупіс помнік маці ў скрусе. У Варшаве існуе знаная бронзавая Сырэна зь мечам і шчытом. У Рызе помнік Свабоды з даваенных часоў — жанчына-Латвія, якая трымае ў руках тры зоркі — па колькасьці земляў, якія складаюць краіну. Як я ні напружваў памяць, анічога падобнага ў нас не прыгадаў.

Возьмем пляцы горада-героя Менска. Аграмадны Ленін на аздобленай барэльефамі бронзавай трыбуне. Непадалёк — камень, на мейсцы якога не пасьпелі паставіць помнік яшчэ аднаму слаўнаму змагару супраць беларушчыны тав. Мясьнікову. Ёсьць, праўда, аграмадны помнік Якубу Коласу разам з пэрсанажамі ягоных твораў. Ёсьць і досыць сьвежы, пастаўлены прыканцы 70-х гадоў, помнік усесаюзнаму старасту тав. Калініну. А дзе ж матка-Айчына, або тая ж Эўфрасіньня Полацкая? Ейную постаць мы адно бачылі ў эмблеме леташняга Зьезду беларусаў сьвету: увасабляючы Беларусь, яна трымае ў руках, нібы сьвечку, зроблены Лазарам Богшам крыж.

Зрэшты, нашыя скульптары ўсё ж не абыходзілі ў сваёй творчасьці жаночую тэму. Напрыклад, у Жодзіне ёсьць «Манумэнт у гонар савецкай маці-патрыёткі» (дзяржпрэмія СССР 1977 г.). Або ўзяць скульптуру на пр. Машэрава «Мінск — горад-герой», які ўвасоблены чамусьці ў жанчыне (?!) накшталт валгаградзкай (савецкі стандарт), але з трубамі замест зброі. Вось такая вам маці-Беларусь. Атрымліваецца, што народы, якія маюць відавочна мужчынскі характар, ставяць помнікі жанчынам. У нас жа, народу жаноцкага, бадай, самаю сымбольнаю скульптураю ёсьць помнік жыхару Хатыні з гаротнымі вачыма й зь мёртвым сынам на руках. Радкі побач сьцьвярджаюць: «Вы сьмерць прынялі, ды полымя сэрцаў Вашай любові да Савецкай Радзімы навек незгасальна».

## Крыжы

Калі Летува 11 сакавіка 1990 г. абвясьціла пра аднаўленьне сваёй незалежнасьці і выхад з СССР, у Вільні неўзабаве быў адбудаваны зьнішчаны Саветамі помнік Трох Крыжоў. А пад Шаўлямі існуе Крыжовая гара, якую летась у верасьні наведаў Папа Рымскі.

Свой пакутніцкі крыж ёсьць і ў нас у Курапатах, ён — сымболь беларускіх лёсаў у XX ст. Нездарма намэнклятура спрабавала зрабіць з Курапатамі катынскі фінт, г.зн. сьпіхнуць усё на немцаў. Не атрымалася. Тады паспрабавалі да мінімуму зьвесьці меркаваную колькасьць ахвяраў. Клінтан у Курапатах — новы прыступ нянавісьці. А там стаіць усяго толькі крыж...

## Жаўнеры

У Берасьці, у фартэцыі ёсьць велізарны манумэнт салдацкай славы. Я ніяк не магу скеміць, што б ён мог сёньня сымбалізаваць для нас. На жаль, той жаўнер абараняў зусім не Беларусь. Пры іншых умовах Сталін у 1944-м аддаў бы разам зь Беласточчынай і Берасьце.

Бэрлінскі Трэптаў-парк аздабляе вядомая скульптура жаўнера зь мечам і зь дзяўчынкаю на руцэ. Кажуць, што прататыпам быў адзін менскі рабочы, пра якога нагадвае дошка на Скарынавым праспэкце. Але нідзе не пісалі, адкуль ён, а толькі што рускі ды з Расеі.

Жанчыны. Якая жанчына ўвасабляе беларускі дух, беларусаў? Цётка, Харужая, Мазанік, Корбут? Мабыць, Ларыса Геніюш. Але трэба, каб яе ведалі, каб нават паляк або ўкраінец, запытаны пра беларусак, назваў менавіта яе.

## Мужчыны

Нават з украінцаў мы ведаем нямала каларытных асобаў, якія сапраўды — постаці. Хмяльніцкі, Мазэпа, Скарападзкі, Пятлюра, Бандэра. Нават літаратурны Тарас Бульба шырока вядомы. А хто ў нас, зноў-такі калі глядзець вачыма суседзяў? Скарына, начальнік Чукоткі, дзед Талаш, Дзямянцей? А можа Філарэт? Вельмі ж паважна ён выглядае ў парляманце. Добрым прыкладам беларускага прыстасаванства служыць Грамыка, які, не пакінуўшы ў пашпарце сьлядоў свайго «инородства», утрымаўся пры ўсіх генсэках, пачынаючы з Сталіна.

## Сымбалі

У аднога майго знаёмца першы тост абавязкова «за беларускую птушку бусла». Ёсьць яшчэ беларускі зубар, але ён даўно зьнік з нашых «МАЗаў» ды застаўся быў толькі на цыгарэтным пачаку, а цяпер яшчэ зьявіўся на рукавох у міліцыянтаў. У Хатыні нас увогуле высадзілі трыма «белыми русскими берёзками», а чацьвертаму нават крыжа не паставілі. На хатынскіх сымбалічных могілках усіх спаленых беларускіх вёсак няма ніводнага крыжа, нібыта не вясковы хрысьціянскі люд склаў галовы, а — райкам у поўным складзе.

**Сяргей АСТРАЎЦОЎ**



*Зьбігнеў СЬВЕНХ*

# Закляцьце Казімера Ягайлавіча

*Пачатак у №№1—8*

Ад самага пачатку існаваньня Школы інжынэраў Літоўскага корпусу ў Вільні Гуцэвіч займаў там пасаду прафэсара архітэктуры, тапаграфіі і геаграфічных картаў, але напрыканцы 1793 году ён атрымаў ад асобнай тады Літоўскай Адукацыйнай камісіі прызначэньне на вартую яго пасаду прафэсара цывільнай архітэктуры Віленскай акадэміі. Але ён не прыступіў адразу ж да выкананьня новага абавязку, бо краіну трэсла ў ліхаманцы розных забурэньняў; наадварот, падчас паўстаньня 1794 году ўдзельнічаў у паспалітым рушаньні. Паранены ў сутычцы пад Воранавам, Гуцэвіч вярнуўся ў Вільню, дзе неўзабаве пачуў жудасную вестку пра сьмерць біскупа Масальскага...

... Змучаны несупыннаю й цяжкою працаю, у смутку і амаль што ва ўбостве ПАМЁР 21 СЬНЕЖНЯ 1798 ГОДУ АД ВАДЗЯНКІ, МАЮЧЫ 44 ГАДЫ ЖЫЦЬЦЯ, ГОДНАГА СЛАВЫ.

Гуцэвіча меліся пахаваць сьціпла і ўбога, адпаведна ягонаму дастатку; палічыўшы гэта за зьнявагу парэшткаў калегі, рэктар Акадэміі Пачобут загадаў справіць грамадзкім коштам урачыстае пахаваньне на могілках аа. Місыянэраў. Але, бадай што, найпрыстойнейшае мейсца для парэшткаў дойліда было ў катэдры, магчыма, з такім надпісам: «Si monumentum quaeris, circumspice» ("Калі шукаеш помнік, то азірніся навокал").

**ФРАНЦІШАК СМУГЛЕВІЧ, ПАПЯРЭДНІК ЯНА МАТЭЙКІ Ў ГІСТАРЫЧНЫМ ЖЫВАПІСЕ, ТАКСАМА БЫЎ УЛЮБЁНЫ Ў ЛІТВУ Й ВІЛЬНЮ.**

Раставецкі, аўтар «Слоўніка польскіх мастакоў» (Варшава, 1851 г.), падае, што ён быў сынам мастака Лукаша і Рэгіны з Алясінскіх, пляменьніцы славутага тады мастака Сымона Чаховіча. Нарадзіўся Смуглевіч 6 кастрычніка 1745 г. у Варшаве. Клопатамі бацькоў ён атрымаў неблагую адукацыю. Паходзячы з роду мастакоў, рана адчуў у сабе пакліканьне жывапісца, і ўжо ў 17 гадоў хлопец, што вучыўся пад кіраўніцтвам Чаховіча, прыводзіў неаспрэчныя доказы сваіх здольнасьцяў. У 1763 г. бацька за ўласныя грошы выправіў Францішка ў Рым, дзе ён хутка пераўзышоў бацькоўскія спадзевы. На другім годзе жыцьця у Рыме Смуглевіч атрымаў першую прэмію Акадэміі, прычым разам зь ім у спаборніцтве ўдзельнічаў францускі мастак Давід, які займеў потым вялікую славу. Водгульле гэтага посьпеху дайшло да караля Станіслава Аўгуста, які падбадзёрыў суайчыньніка і заахвоціў падарункамі. Францішак яшчэ доўга прабыў у Рыме ды іншых гарадох Італіі, дасканалячы талент сярод найвялікшых помнікаў мастацтва разам зь іншымі выдатнымі мастакамі.

Калі Смуглевіч быў у Рыме, некалькі ангельскіх паноў, захопленых талентам мастака, прапанавалі яму прыбытковае мейсца ў сваёй краіне, але мастак не пагадзіўся, бо прагнуў прысьвяціць талент Радзіме. Каля 1785 году ён прыехаў у Польшчу. Адразу ж пасьля прыбыцьця ў Варшаву Смуглевіч на даручэньне караля ўзяўся маляваць абразы для касьцёлу аа. Базылянаў. Неўзабаве біскуп князь Масальскі запрасіў яго ў Вільню. У 1797 годзе Смуглевіч стаў прафэсарам жывапісу ў Віленскай акадэміі.

ФРАНЦІШАК СМУГЛЕВІЧ АЗДОБІЎ КАТЭДРУ ЎСЯРЭДЗІНЕ ПАСЬЛЯ ТАГО, ЯК ЯЕ ПЕРАБУДАВАЎ ЛАЎРЫН ГУЦЭВІЧ, прычым пры заканчэньні яму дапамагаў брат Антон.

Мастацкае афармленьне авальных капліцаў прыпала на час, калі ўжо не было Гуцэвіча, а аднаўленьнем катэдры кіраваў архітэктар Міхал Анёл Шульц (далей пра ягоную асобу ды высілкі на карысьць катэдры яшчэ будзе гаворка). Нарэшце, у 1801 г. рэстаўрацыя была завершаная.

Зразумела, Смуглевічава праца не абмяжоўваецца толькі адною катэдраю. З найзначнейшых выяваў, безумоўна, трэба адзначыць абраз «Хрыстос укрыжаваны». Намаляваны прыканцы жыцьця мастака для катэдры, у 1837 г. ён быў перанесены ў капліцу Таварыства Дабрачыннасьці на Віленскай вуліцы. У касьцёле сьв. Пятра й Паўла на Антокалі знаходзіцца абраз «Разьвітаньне сьв. Пятра са сьв. Паўлам» — адзін з найлепшых у мастака.



Сярод твораў, што прызначаліся для прыватных калекцыяў, вартыя асаблівай увагі карціны «Сям'я князя Масальскага», «Ахвяраваньне Вэсталкі», «Геній славы агалошвае імёны рупліўцаў на ніве навукі», «Шчыт мудрасьці прыкрывае тых, хто прысьвяціў сябе навукам» і шмат яшчэ якія, напісаныя ў часе найбольшага росквіту таленту майстра — ягонага першага прыезду ў Вільню. Кампазыцыя надзвычайная — так ахарактарызаваў творы мастака Эдвард Раставецкі ў 1851 г. Ён пералічвае некалькі дзясяткаў працаў Смуглевіча на рэлігійныя ды гістарычныя тэмы...

НЯМЕЦКІ ЛІТАРАТАР І АДНАЧАСОВА ВЫСОКІ РАСЕЙСКІ ДАСТОЙНІК, АЎГУСТ КОТЦЭБУ «ЧЫНІЎ ПАДКОПЫ» ФРАНЦІШКУ СМУГЛЕВІЧУ ЗА ЯГОНЫЯ ФРЭСКІ Ў МІХАЙЛАЎСКІМ ПАЛАЦЫ, ДЗЕ ЛЮБІЎ ЖЫЦЬ ЦАР ПАВЕЛ.

Паўсюль вядомы тады Аўгуст Котцэбу доўгі час жыў у Расеі, а потым вярнуўся ў Нямеччыну, у Ляйпцыг. Аднак на радзіме прызнаньне таленту гэтага чалавека не было такім вялікім, як за мяжою — ягоныя драмы й камэдыі, поўныя прынцыпаў, якія неадменна ўваходзілі ў тагачасны рэпэртуар, не падабаліся тагачаснай Нямеччыне, дзе штораз большыя ўплывы набывалі таемныя гурткі моладзі ды суседзтва рэвалюцыйнай Францыі. Затое ў Расеі творы Котцэбу мелі шалёны посьпех, іх ставілі нават у аддаленых сыбірскіх мясьцінах.

**Пераклад Пятра РАГОЙШЫ**

*Далей будзе*



© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

